краю, пра сутнасць жыцця, дасканала раскрыў народную мару пра справядлівае грамадства.

### Бібліяграфічны спіс:

1. Караткевіч, У. Летапіс жыцця і творчасці / У. Караткевіч // [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://karatkevi.ch/bio/letapis.html. – Дата доступа: 24.03.2023.

2. Караткевіч, У. Ладдзя Роспачы / У. Караткевіч // [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://knihi.com/Uladzimir_Karatkievic/Laddzia_rospacy.html. – Дата доступа: 25.03.2023.

3. Караткевіч, У. С. Збор твораў. У 25 т. Т. 1. Паэзія, 1950—1960 / У.С. Караткевіч; прадм., падрыхт. тэкстаў і камент. А. Вераб’я; рэд. тома В. Рагойша. – Мінск : Маст. літ., 2012. – 533 с.

## «ЛАДДЗЯ РОСПАЧЫ» У. КАРАТКЕВІЧА: ЖАНРАВАЯ СПЕЦЫФІКА

***М. Г. Ясінская***
*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», г. Мінск*

*Навуковы кіраўнік – Н. В. Заяц, кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

**Анатацыя.** Даследуецца жанравая прырода твора У. Караткевіча «Ладдзя Роспачы». Выяўляюцца жанравыя рысы легенды, філасофскай аповесці і навелы, разглядаецца спецыфіка іх спалучэння ў творы.

**Ключавыя словы:** У. Караткевіч; жанр; легенда; філасофская аповесць; навела.

У сучасным літаратуразнаўстве актуальнай застаецца праблема жанравай атрыбуцыі мастацкага тэксту. Так, напрыклад, няма агульнага меркавання наконт жанравай прыналежнасці «Ладдзі Роспачы» У. Караткевіча. Сам аўтар адзначаў, «што піша навелу аб адным сярэдневяковым беларускім «зламірозе», які любіў жыццё, што атрымліваецца «дзікая, але своеасаблівая мешаніна з »Дэкамерона», Рабле, французскіх фаблё і беларускіх не вельмі прыстойных казак»« [2]. Паводле задумы пісьменніка, гэта навела, хаця ў гісторыю літаратуры «Ладдзя Роспачы» ўвайшла як аповесць (у 5 томе 25-томнага Збору

твораў адноўлена аўтарскае вызначэнне жанру) [5]. Побач з гэтым многія караткевічазнаўцы гавораць, што ў «Ладдзі Роспачы» пераважаюць рысы аповесці. Спынімся на некаторых жанравых дэфініцыях, ужытых у дачыненні да твора.

**1. Легенда.** Сваім сюжэтам і некаторымі іншымі рысамі «Ладдзя Роспачы» нагадвае народную казку ці легенду. «Легенда (лац. legenda – вартае прачытання) – невялікае фальклорнае або літаратурнае апавяданне, у аснове якога ляжыць расказ пра нейкую незвычайную падзею або геройскі ўчынак выдатнага чалавека» [6, с. 164]. «У літаратурных легендах за аснову бярцуцца фальклорныя гісторыі. У беларускіх легендах знайшлі адлюстраванне розныя ўяўленні людзей, якія імкнуліся растлумачыць паходжанне зямлі, чалавека, жывёл, асаблівасці ландшафту і расліннага свету свайго краю, сутнасць розных з'яў прыроды і сацыяльных адносін» [3]. У аснову «Ладдзі Роспачы» не пакладзена народная гісторыя, але ў гэтым творы ўздымаецца «легендарная» праблема жыцця і смерці, інтэрпрэтуецца матыў продажу душы – праз гісторыю пра заклад са Смерцю, а таксама праз апеляцыю да міфаў і паданняў антычных Грэцыі і Рыма.

«Ладдзя Роспачы» мае характэрны для фальклорных твораў зачын: «Жыў сабе год чатырыста назад у беларускім горадзе Рагачове небагаты, але добрага роду дваранін па прозвішчы Гервасій Выліваха» [4, с. 130]. Вобраз галоўнага героя, зуха і зламірога, заўсёды гатовага на новыя прыгоды, падобны да Несцеркі (В. Вольскі. «Несцерка»). На жанравае падабенства з твора фальклорам звяртаў ўвагу А. Верабей: «Пісьменнік, па-майстэрску выкарыстоўваючы ўмоўна-фантастычныя прыёмы жанру фальклорных і агіяграфічных твораў, паказвае прыгоды Вылівахі ў падземным царстве» [2].

**2. Філасофская аповесць.** Шэраг даследчыкаў (у прыватнасці Д. Бугаёў, А. Русецкі) гавораць пра філасофскую скіраванасць «Ладдзі Роспачы». Адной з вызначальных рыс філасофскай аповесці з'яўляецца двухпланавасць, спалучэнне фантастыкі з рэальнасцю. У «Ладдзя Роспачы» гэта назіраецца. Дзеянне пачынаецца ў рэальным свеце – у горадзе Рагачове. Далей ідзе апісанне прыгод Гервасія Вылівахі з сябрамі, кпінаў з мясцовых улад, сустрэчы з Бонай Сфорцай. Але хутка гэта панаванне жыцця перарываецца прыходам Смерці. Бязвокая вядзе Гервасія ў царства памерлых – у свет фантастычны. Там ужо акрамя людзей з'яўляюцца вобразы міфічных істот: перавозчыка Харона-Шолаха, Арахны, лемураў. Гэтая двухпланавасць дапамагае раскрыць філасофскую праблему, якая падымаецца ў творы: адносіны чалавека і смерці.

У філасофскай аповесці абыходжанне з ідэямі, важнымі праблемамі дастаткова вольнае. Усім вядома, што ніхто не можа пазбегнуць сустрэчы са Смерцю, гэта вечны кругазварот: нешта заўсёды памірае, але абавязкова нараджаецца новае. Аднак У. Караткевіч змог вывесці сваіх герояў з гэтага бесперапыннага кола. У Гервасія атрымалася падмануць і перайграць

непераможную Смерць і тым самым парушыць сцвярджэнне пра бездапаможнасць чалавека перад ёю. Пісьменнік паказаў іншы погляд на каралеву царства памерлых. Чытач бачыць, што гэта звычайная жанчына, якой калісьці здрадзіў каханы і якая зараз злуецца на ўвесь свет.

«Ладдзя Роспачы» – маніфест жыцця, сцвярджэнне таго, што не такая ўжо і непераможная жанчына з касою, паказ таго, як чалавек са сваім жыццялюбствам змог падмануць саму Смерць. Гэта надае твору падабенства з утопіяй. Вядома, Гервасій таксама калі-небудзь памрэ, але ў царства памерлых, як і першы раз, ён пойдзе без страху.

Адной з рыс філасофскай аповесці з’яўляецца выкарыстанне сатыры для таго, каб у больш простай форме паказаць важную праблему (напрыклад, рэнегацтва, здрадніцтва роднай зямлі). Так, як адзначыў Д. Бугаёў, у творы «дасталося і кіеўскаму князю Уладзіміру за разарэнне Полацкага княства, і рускаму цару Івану Грознаму, якога ў нас усё часцей называюць Іванам Жахлівым, бо ён асабліва лютаваў на беларускіх землях, перапала і тым здраднікам, якія дапамагалі прыхадням вынішчаць насельніцтва нашага краю» [1]. У. Караткевіч асабліва бязлітасны да магнатаў і святароў горада Рагачова, з якіх здзекуецца Выліваха. З’едліва і іранічна апісвае пісьменнік рабунак царкоўнага дабра і здарэнне са скрынкай святога Юры: «Над гэтай скрынкай счапіліся ўсе. І замкавыя вялікія людзі, і касцельныя, і людзі царквы. Кожны хацеў давесці, што гэта яму, а таму іншых усіх паплюжыў і выкрываў. І выявілася, што толькі садомскага граху ў горадзе і не было. І так гэта было брыдка, што сяляне пасля таго цэлы год баяліся ездзіць на торг – калі ўжо там такія начальныя людзі» [4, с. 132].

Для філасофскай аповесці характэрны філасофскія дыялогі, у якіх часцей за ўсё і адлюстроўваецца пазіцыя аўтара. Так, амаль усе дыялогі Гервасія са Смерцю носяць філасофскі характар: разважанні Бязвокай наконт здрадлівай жаночай прыроды, погляды Вылівахі на чалавечую сутнасць, цягу да жыцця, сэнс людскіх учынкаў. Самай пранікнёнай, на наш погляд, з’яўляецца размова рагачоўца са здраднікам Шолахам пра вечнасць беларускай песні.

«– Няўжо гэта яшчэ жывуць і зямля і песні? – неспакойна заварушыўся стырнавы. – Няўжо?

– А што, думаеш, памерла? – спытаў Гервасій.

– Мне было б лягчэй, каб памерла...

І раптам ён закрычаў:

– Гэта павінна было памерці! Чаму яно не памерла! Яно законна ішло да смерці, і я раней за другіх зразумеў гэта! Чаму яно не памерла, ты, які жартуе?! Чаму?!

– Таму, што я жартую, – сказаў Выліваха. – Толькі таму. Я люблю жыццё і жартую. І таму – колькі б ты ні здраджваў – яно жыве» [4, с. 147–148].

**3. Навела.** У творы прысутнічаюць рысы навелістычнага жанру – сам

аўтар менавіта так вызначаў «Ладдзю Роспачы». «Навела характарызуецца напружаным, драматычным дзеяннем, <…> нечаканым фіналам» [6, с. 36]. У «Ладдзі Роспачы» з самага пачатку прыгоды Вылівахі ў свеце жывых і памерлых вымушаюць чытача з цікавасцю вандраваць разам з героем. Фінал нечаканы і нетрадыцыйны для падобнага сюжэта: Гервасій змог пераадолець адвечнае панаванне смерці над чалавекам.

Для навелы таксама характэрны вострага інтрыга і яркія вобразы. Інтрыга разгортваецца вакол галоўнага пытанння: ці ўдасца Гервасію перамагчы Смерць. Самым напружаным момантам у творы з'яўляецца партыя смелага рагачоўца з Бязвокай, у якой галоўны герой дзякуючы сваёй хітрасці перамагае. Гервасій – найбольш яркі вобраз у «Ладдзя Роспачы». «Сабою быў дзівосна гожы і пяшчотны, а паводзін – самых заганных. Хобаль, залётнік, піяка, задзіра, біток, бабздыр несамавіты. Не было на ўсёй зямлі беларускай падобнага яму» [4, с. 130] – такая аўтарская характарыстыка адразу прымушае сачыць за развіццём героя. Пасля прыходу Смерці, што з'яўляецца імпульсам у навеле, адбываецца эвалюцыя Гервасія, які аказваецца не зламірогам, а мудрым, жыццелюбівым, непрымірым з несправядлівасцю чалавекам.

Такім чынам, у творы У. Караткевіча «Ладдзя Роспачы» спалучаюцца адзнакі легенды, філасофскай аповесці, навелы. Сінтэз розных жанравых рыс дазволіў пісьменніку стварыць непаўторны тэкст, які напоўнены народным каларытам, гумарам, цікавымі вобразамі і ў якім падымаюцца «вечныя» тэмы і праблемы. Гэтым і іншымі творамі У. Караткевіч пашырыў жанравыя межы беларускай літаратуры, узбагаціў нацыянальнае слоўнае мастацтва.

### Бібліяграфічны спіс:

1. Бугаёў, Д. Рамантычны рыцар чалавечнасці [Электронны рэсурс] / Д. Бугаёў // Уладзімір Караткевіч : сайт. – Рэжым доступу: https://karatkevi.ch/kritika/ramantychny-rycar-chalavechnasci.html. – Дата доступу: 12.03.2023.

2. Верабей, А. Гармонія хараства і праўды [Электронны рэсурс] / А. Верабей // Уладзімір Караткевіч : сайт. – Рэжым доступу: https://karatkevi.ch/kritika/verabei-abudzhanaja-pamjac/verabei3.html. – Дата доступу: 12.03.2023.

3. Кабашнікаў, К. Жанравы склад беларускай народнай прозы [Электронны рэсурс] К. Кабашнікаў // Моваznaўства. – Рэжым доступу: http://mowaznaustwa.ru/2011/11/20/kabashnika%D1%9E-k-zhanravy-sklad-belaruskaj-narodnaj-prozy/. – Дата доступу: 12.03.2023.

4. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ., 1987–1990. – Т. 2 : Аповесці, апавяданні, казкі. – 1988. – 511 с.

5. Караткевіч, У. Збор твораў : у 25 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ., 2012–2019. – Т. 5 : Легенды. Навела. Паэма. Аповесць : 1960–1972 ; падрыхт.

тэкстаў і камент. П. Жаўняровіча і Л. Вераб'я ; рэд. тома В. Іўчанкаў. – 2013. – 541 с.

6. Рагойша, В. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах : дапам. / В. Рагойша. – Мінск : Беларус. Энц., 2001. – 384 с.